Перавод традыцыйнага каталога ў машыначытальную форму ажыццяўляўся шляхам набору бібліяграфічных элементаў непасрэдна з дакументаў de visu. Сканіраванне картак было немагчыма з-за іх нізкай якасці. Акрамя таго, адначасова з уводам бібліяграфічнага апісання дакументаў з'явілася неабходнасць зверкі фонду з каталогам і інвентарнымі кнігамі, каб у ЭК не трапілі памылковыя запісы. Пры каталагізацыі дакументаў для ЭК даводзілася вырашаць шмат праблемных пытанняў. Адно з самых складаных – лінгвістычнае забеспячэнне праграмы, выбар і азначэнне мовы і спосабу сэнсавай апрацоўкі. У выніку лагічнай і структурнай інтэграцыі розных дэскрыптарных слоўнікаў (ІНІГН, УІНІТІ) створаны і папаўняецца двухмоўны слоўнік ключавых слоў для НББ. У практыцы работы прымаюцца рашэнні па выбару мовы бібліяграфічных запісаў у сувязі з неабходнасцю аб'яднання ў адзіным шэрагу бібліяграфічных запісаў аднаго аўтара, творы якога выдаваліся на розных мовах з іншай моўнай графікай.

Падсістэма "Беларуская рэтраспекцыя" звязана з падсістэмай аўтаматызацыі абслугоўвання, якая прадстаўляе карыстальнікам наступныя магчымасці: тэматычны пошук у ЭК і раздрукоўку спісаў; аўтаматызаванае афармленне запытаў чытачоў на літаратуру і перадачу іх па каналах сувязі фондатрымальніку; падрыхтоўку каталагізацыйных апісанняў выданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Зыгмантовіч С.В. (Мінск)*

## СУПРАЦОЎНІЦТВА ВНУ І БІБЛІЯТЭК ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДЛЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СФЕРЫ

Прынцыпы супрацоўніцтва нашага факультэта і бібліятэк заснаваны на ўзаемнай зацікаўленасці ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і таму яны распаўсюджваюцца не толькі на вучэбны працэс, але і на вызначэнне асноўных спецыяльнасцей і спецыялізацый, прагназіраванне патрэбнасцей у кадрах, маніторынг працаўладкавання выпускнікоў, арганізацыю падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнаму набору для пэўных бібліятэк.

Супрацоўніцтва ахоплівае ўсе этапы сістэмы бесперапыннай падрыхтоўкі кадраў. Сёння надзвычай важнай праблемай з'яўляецца прафарыентацыйная работа, выхаванне на этапе дапрафесійнай падрыхтоўкі свайго абітурыента. Значны патэнцыял у гэтым кірунку маюць такія формы, як стварэнне ў школах "бібліятэчных класаў", функцыянаванне пры бібліятэках вучэбна-вытворчых камбінатаў.

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) бачыць таксама перспектыўнай у гэтым кірунку работу па больш актыўнаму разгортванню рэкламна-інфармацыйнай дзейнасці аб новых формах, змесце, магчымасцях атрымання бібліятэчнай адукацыі: падрыхтаваны даведнік аб факультэце, web-сайт факультэта, лакальныя электронныя носьбіты з прэзентацыяй факультэта і кафедраў і інш. Але без інтэграцыі намаганняў адукацыйных установ і бібліятэк павысіць дзейснасць прафарыентацыйнай работы немагчыма.

ФІДК знаходзіцца сёння на старце новага этапу ў сваім развіцці: ідзе падрыхтоўка для пераводу працэсу навучання спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй па новай двухступеньчатай сістэме — *бакалаўрыят — магістратура*, рэалізацыя якой патрабуе аднаўлення зместу, тэхналогій навучання.

Навуковыя напрацоўкі, замежны вопыт, а таксама вынікі эксперымента па ўвядзенню шматступеньчатай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў у рэспубліцы даюць магчымасць вызначыць мэтавую накіраванасць падрыхтоўкі бакалаўраў як малодшых спецыялістаў шырокага профілю з вышэйшай адукацыяй, падрыхтаваных да самастойнай працы па профілю спецыяльнасці; магістраў як спецыялістаў, якія атрымалі дадатковую падрыхтоўку ў пэўным напрамку і абаранілі магістарскую дысертацыю. У залежнасці ад тыпу магістарскай падрыхтоўкі (акадэмічная ці даследчая) выдзяляюць кваліфікацыю магістраў: магістр-менеджэр, які павінен валодаць навейшымі тэхналогіямі кіравання, і магістр-даследчык, які будзе займацца навуковай альбо навукова-педагагічнай дзейнасцю.

Не менш значнымі пытаннямі агульнага характару для бібліятэк і адукацыйных установ з'яўляюцца пытанні навуковага абгрунтавання штатнага раскладу бібліятэк з улікам новых кваліфікацый падрыхтоўкі спецыялістаў, правядзенне даследаванняў па вызначэнню перспектыў патрэбнасцей бібліятэк у кадрах рознага ўзроўню кваліфікацыі: малодшых спецыялістаў сярэдняга ўзроўню — бакалаўраў, вышэйшага ўзроўню — магістраў, навуковых работнікаў — кандыдатаў і дактароў навук.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Факультэт на сённяшні дзень ажыццяўляе падрыхтоўку бібліятэчных спецыялістаў па сямі спецыялізацыях (інфармацыйнае забеспячэнне навукова-тэхнічнага і медыцынскага комплексу; бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства; бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва; маркетынг бібліятэчнай справы; бібліятэказнаўства і бібліяграфія, замежная мова; кнігазнаўства і менеджмент кніжнага гандлю; аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы). Двайную спецыяльнасць атрымліваюць выпускнікі, якія навучаюцца па спецыяльнасці "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура".

Аналіз сучасных тэндэнцый у развіцці інфармацыйна-дакументных камунікацый, вывучэнне публікацый у спецыяльным друку дазволіў нам прапанаваць падрыхтоўку кадраў па здвоеных спецыяльнасцях.

Сярод прапаноў: падрыхтоўка спецыялістаў па здвоенай спецыяльнасці *"Бібліятэказнаўства і бібліяграфія. Прафесійнае навучанне"* з кваліфікацыяй *"Бібліятэкар-бібліёграф. Выкладчык спецыяльных дысцыплін"*.

Прапанавана ўвесці таксама падрыхтоўку спецыялістаў па здвоенай спецыяльнасці, такой як *"Бібліятэказнаўства і бібліяграфія. Практычная псіхалогія"* з прысваеннем кваліфікацыі *"Бібліятэкар-бібліёграф. Псіхолаг"*. Галоўная мэта адкрыцця дадзенай спецыяльнасці — задаволіць патрэбнасці публічных, дзіцячых і іншых бібліятэк у кваліфікаваных кадрах, здольных не толькі аказваць разнастайныя псіхалагічныя паслугі карыстальнікам і персаналу, арганізаваць і падрымліваць псіхалагічную службу, але і прадастаўляць бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі з улікам псіхалагічных асаблівасцей абанентаў, выкарыстоўваючы дасягненні бібліятэрапіі, агульнай, узроставай псіхалогіі.

У адказ на патрэбнасці практыкі прапаноўваецца і такая спецыяльнасць, як *"Бібліятэказнаўства і бібліяграфія. Сацыяльная работа"* з прысваеннем кваліфікацыі *"Бібліятэкар-бібліёграф. Культарганізатар"*. Сёння ў краіне актывізаваўся працэс аб'яднання бібліятэк і клубаў, і, на жаль, часта пытанне аб супрацоўніку гэтай установы вырашаецца не на карысць бібліятэчнага спецыяліста. Падрыхтоўка спецыялістаў па прапаноўваемай спецыяльнасці дазволіць узбагаціць дзейнасць розных устаноў, накіраваных на дапамогу насельніцтву ў арганізацыі і культурным правядзенні вольнага часу, прафілактыку і прадухіленне дэвіянтных паводзін, арганізацыю сацыяльна-культурнай дзейнасці людзей з абмежаванымі псіхафізічнымі магчымасцямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аб неабходнасці зблíжэння працэсу падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасцях *"Бібліятэказнаўства і бібліяграфія", "Кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю"* і прысваення выпускнікам кваліфікацыі *"Бібліятэкар-бібліёграф. Менеджэр кніжнага гандлю"* сведчаць наступныя факты: для бібліятэчнай справы і кніжнага гандлю агульным аб'ектам дзейнасці з'яўляецца кніга, як і многія тэхналагічныя працэсы, звязаныя з яе бібліяграфічным і інфармацыйным афармленнем (вызначэнне індэксаў ISBN, УДК, ажыццяўленне штрыхавога кадзіравання, выкарыстанне агульных фарматаў прадстаўлення данных аб кнігах і г.д.), інфармацыйным суправаджэннем прадстаўлення кнігі на інфармацыйным рынку, ажыццяўленнем інфармавання аб кнігах карыстальнікаў інфармацыі. Кніжны рынак сёння ўсе больш актыўна выкарыстоўвае бібліяграфічныя метады гандлю, якія ў заходніх краінах ужо паказалі свае перавагі. Асабліва відавочна зблíжэнне тэхналогій ва ўмовах укаранення аўтаматызацыі.

Для падрыхтоўкі магістраў па бібліятэчнай спецыяльнасці кафедра прапаноўвае спецыялізацыю *"Менеджмент бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці"*.

Функцыі арганізатара распрацоўкі канцэпцый новых спецыяльнасцей мог бы выконваць *Камітэт па навуцы, кадрах і кадравай палітыцы*, стварэнне якога з'яўляецца аб'ектыўна неабходным у структуры ББА.

Актуальнымі кірункамі дзейнасці камітэта і ўсёй бібліятэчнай супольнасці павінны стаць фарміраванне і падтрымка ўсіх форм і звенняў сістэмы бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі, развіццё альтэрнатыўных форм дапаўняльнай адукацыі, стварэнне трэнінг-цэнтраў.

У сувязі з пашырэннем на сённяшні дзень суб'ектаў сістэмы бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі пад эгідай ББА можна было б ажыццявіць і фарміраванне адзінай інфармацыйна-метадычнай прасторы.

Спецыяльнай увагі з боку ББА заслугоўвае работа з маладымі кадрамі: Камітэт па навуцы, кадрах і кадравай палітыцы ББА мог бы ініцыіраваць правядзенне навуковых канферэнцый, рэспубліканскіх аглядаў-конкурсаў, якія б садзейнічалі развіццю і падтрымцы творча адоранай моладзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ